

Нефармат

# ВЯСНОВАЯ РАНІЦА

На гэтыя радкі натхнілі здымкі з двух мерапрыемстваў, што паявіліся ў панядзелак на сайце нашай газеты. Адзін рэпартаж быў з Купалавай Вязынкі, дзе традыцыйна гукалі вясну, другі — з Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, дзе адзначалі абрадавыя Саракі. Ведаеце, што здзівіла і ўразіла? Голыя чорныя дрэвы. Здымкі ж рабіліся ў мінулыя выхадныя. Падумалася, няўжо гэта ў нашай краіне? У мяне за акном зусім іншая карціна.

У нас пейзажы спрэс зялёна-белыя. Дрэвы дружна выпусцілі зялёную лістоту, на выездзе з Брэста з кіламетр ехалі ў бок Камянецкага кальца, абапал дарогі — квітнеючая чаромха і белыя садовыя дрэвы, што засталіся ад былых сядзіб вёскі, якую даўно праглынуў горад. У Матыкалах, вёсцы за дзевяць кіламетраў ад горада, на прывязі пасуцца каровы. Наш вясковы дом знаходзіцца ў пяцідзесяці кіламетрах на поўнач ад абласнога цэнтра. Тут яшчэ не так усё расквітнела, як у горадзе і яго ваколіцах. Чаромха толькі-толькі зацвітае, але двор ужо пакрыты жоўтымі дзьмухаўцамі, а ў суседзяў вялікая разгалістая алыча, якую мы завём сакурай, стаіць, нібы малаком аблітая. І ў нас зацвітаюць слівы, маленькі абрыкос, які я пасадзіла два гады таму, упершыню выкінуў першыя нясмелыя кветачкі. Яблыні толькі выпусцілі кволыя лісткі, за якімі ўжо ўгадваюцца будучыя суквецці. Людзі шчыруюць на агародах, некаторыя садзяць бульбу.

Такога на маёй памяці дакладна не было, каб на Дабравешчанне пейзаж нагадваў карціну канца красавіка, а менавіта тыя дні, якія нястомны збіральнік роднага слова, дыялектаў, гісторыі свайго краю Алесь Зайка называў раем на зямлі. Алесь Фаміч сабраў бясцэнныя скарбы народнай мудрасці, напісаў некалькі кніг пра сваю Косаўшчыну і іншыя паселішчы Івацэвіцкага раёна. Яго ўжо няма з намі больш як шэсць гадоў. Я сустракалася з ім усяго адзін раз, а ўспамінаю кожную вясну. Ездзіла да яго, дарэчы, ранняй вясной. Праводзячы мяне, ён стаяў каля веснічак, паказаў рукой у бок лесу, прамовіў: «Адзін знаёмы ляснік казаў: «Калі хочаш даведацца, як выглядае рай, ідзі ў лес у канцы красавіка — пачатку мая». І з той пары стараюся не прапусціць гэты «рай», хоць бы праязджаючы па дарозе пасярод лесу. Так было і на гэты раз. Мы ехалі, любаваліся прыгажосцю першай нясмелай зеляніны, якая літаральна некалькі дзён мае асаблівую цнатлівую далікатнасць. Праз тыдзень-другі яна стане больш яркай, упэўненай і не такой прыгожа-безабароннай. А гэтая во, першая, мабыць, і натхніла таго самага лесніка на параўнанне з раем... Дык вось на адным з участкаў лесу, які быў, нібы дываном, пакрыты белымі кветкамі кураслепу, што адцвітае (названыя кветкі паяўляюцца раней за лістоту), пры дарозе стаялі дзве машыны. Саграшыла — падумала, што людзі спыніліся, каб нарваць першацветаў. Але памылілася. Спачатку заўважыла жанчыну і дзяўчынку, наводдаль яшчэ адну сям'ю. Яны фатаграфавалі прыгажосць, ніхто не спакушаўся на расліны, збіраць якія забаронена. Вось вам і райская карцінка. Здраднiцкі камяк падступіў да горла, як жа моцна захацелася, каб так было заўсёды.

Згадала, як у суботу ў адным з рэпартажаў з пасадкі нашага касмічнага экіпажа, акрамя іншага, сказала Марына Васілеўская: «Жадаю ўсім людзям на Зямлі, каб яны шанавалі і берaглі ўсё тое, што мы маем». Думаю, што яна загадзя прадумала сваё першае інтэрв'ю пасля вяртання, рыхтавалася да яго. Выказанае на зямлі прыйшло на душу яшчэ там, калі бачыла Зямлю з космасу. Відаць, адтуль і Зямля наша выглядае крышачку безабароннай і загадкавай. Яна, планета наша, з дапамогай прыроды дае магчымасць чалавеку глянуць на першую прыгажосць вясны, нібы на стварэнне свету, якое мы маем шчасце назіраць кожны год. Але яна сама не можа навучыць людзей цаніць гэта, апошнія павінны неяк самі навучыцца. Няўжо для гэтага патрэбны войны, стыхійныя бедствы, іншыя навалы? Пытанне рытарычнае. Адзін навуковец у нашай газеце растлумачыў пастаянства войнаў тым, што гены чалавека не мяняюцца на працягу тысячагоддзяў. І вось гэтыя людзі з генамі ваяроў будуць заўсёды ўцягваць іншых у канфлікты, правакаваць войны, біцца за ўладу і перадзел свету. Цікавая тэорыя, можа яно і так. Тады цалкам верагодна, што ў гэтых людзей адсутнічаюць гены, якія адказваюць за чалавецкасць і спагаду, за ўспрыманне прыгажосці прыроды, за магчымасць любавання вясновай раніцай.

А што можа быць лепшым за тое, як расцвітае пасаджаная табой кветка альбо дрэва, як паветра гаворыць птушынымі галасамі, як бусел упарта і настойліва адбудоўвае сваё гняздо, нават калі яго скінулі супрацоўнікі электрасетак і вывезлі на звалку. Тады ўсе здзівіліся, што гэтая пабудова важыць не менш за паўтары тоны. Але белы птах не засмуціўся, не здаўся, адбудаваў новае, справіў птушынае наваселле і цешыцца са сваёй сяброўкай, прыгожа стаіць кожную раніцу на адной назе ў чаканні нобага патомства. А ўнізе ходзяць тлустыя шпакі, збіраюць кузурак. Можа, таму мы гэтай вясной назіраем нашэсце божых каровак на столі аднаго з пакояў. Іх тут сотні, і яны не спяшаюцца выбірацца з хаты, нават калі адкрыеш акно і шугаеш ручнікОм. Відаць, не хочуць трапіць у дзюбы шпакам, перачакаюць, пакуль усё распусціцца, трава стане большай, тады і перамесцяцца ў прыроду.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.20 | 20.03 | 13.43 |
| Віцебск — | 6.07 | 19.55 | 13.48 |
| Магілёў — | 6.10 | 19.53 | 13.43 |
| Гомель — | 6.09 | 19.47 | 13.38 |
| Гродна — | 6.35 | 20.17 | 13.42 |
| Брэст — | 6.39 | 20.15 | 13.36 |

## Месяц

*Маладзік 8 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

**Пр.** *Іларыёна, Сцяпана, Яўстрата.*
**К.** *Малгажаты, Міхаліны, Барыса, Генрыха, Макара, Міхаіла.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ЗАЎТРА




# 10 КРАСАВІКА

Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1872** год — нарадзілася (в. Мяхеды, цяпер у Лагойскім раёне) Настасся Фамінічна Купрыянава, маці-патрыётка, пяцёра сыноў якой загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну, прабраз гераіні Манумента ў гонар Маці-патрыёткі ў Жодзіне.



**1900** год — нарадзіўся (в. Багацькаўка, цяпер у Мсціслаўскім раёне) Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі, вучоны-геолаг, географ, эканаміст, статыстык, дэмограф, грамадскі дзеяч, заснавальнік савецкай школы палеапатамалогіі і беларускай школы даследчыкаў антрапагену, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1907** год — нарадзіўся (г. Мінск) Іосіф Антонавіч Матусевіч, акцёр тэатра і кіно, народны артыст Беларусі. Скончыў студыю Беларускага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа (1928), у якім доўгі час працаваў. Іосіф Матусевіч — характарны, камедыйны акцёр. Яго мастацтву ўласцівы востры пластычны малюнак ролі, жыццёвая праўда і яркасць сцэнічных фарбаў. Талент Іосіфа Матусевіча асабліва выявіўся ў беларускім нацыянальным рэпертуары: Куторга («Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча), дзядзька Ясіп («Навальніца будзе» па трылогіі Я. Коласа «На ростанях»), Сымон Рапецька («Бацькаўшчына» К. Чорнага), Войт («Лявоніха» П. Данілава), Суддзя («Несцерка» В. Вольскага), поп Ілья («Званы Віцебска» У. Караткевіча), дзед Цыбулька («Таблетка пад язык» А. Макаёнка) і інш.

У свеце

**1710** год — у Англіі ўступіў у сілу прыняты ў 1709 годзе «Статут каралевы Ганны» — першы ў свеце закон аб аўтарскім праве.

**1800** год — нарадзіўся Іаган Генрых Фрыдрых Карл Вітэ-малодшы, нямецкі юрыст і перакладчык, вядомы як самы юны доктар філасофіі ў гісторыі — навуковую ступень ён атрымаў ва ўзросце 14 гадоў (занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса).

**1907** год — прэм'ер-міністр Расіі Пётр Сталыпін выклаў у Дзяржаўнай Думе праект сваёй зямельнай рэформы. Асноўнымі кірункамі рэформы былі: перадача надзельных зямель ва ўласнасць сялян, паступовае скасаванне сельскай абшчыны як калектыўнага ўласніка зямель, шырокае крэдытаванне сялян, скупка памешчыцкіх зямель для перапродажу сялянам на льготных умовах.



**1912** год — брытанскі лайнер «Тытанік» выйшаў з Саўтгемптанскага порта ў сваё першае і апошняе плаванне.

Так гаварыў...

**МАТЫЯС КЛАЎДЫВУС:**

*«Мудры не той, хто думае, што ўсё ведае, а той, хто разумее, што ведае мала».*

## УСМІХНЕМСЯ

«Прадам партфель, дзённік, сшыткі, алоўкі, ручкі, фарбы, калькулятар. Усё амаль новае».

Барыс, 1«Б».

**— У мяне таксама быў пояс для пахудзення, але потым стаў малы...**



— Доктар, забярыце з маёй палаты гэтага псіха, які паказвае мата-цыкл!

— Вас раздражняе шум рухавіка?

— Не, выхлапныя газы!

**— Тата, а як звалі цешчу Адама?**

**— У яго не было цешчы, сынок... Ён жыў у раі.**

Цікава, ці ёсць жыццё пасля смерці або таксама не.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная — 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.766. Індэкс 63850. Зак. № 891.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 красавіка 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12